| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 130 | Тое ж 21 кастрычніка – 31 снежня 1842 | 102 | 130 | - |
| 131 | Крапасная кніга за студзеньскую і майскую трэць 1843 | 22 | 14 | - |
| 132 | Тое ж 1 верасня – 31 снежня 1843 | 9 | 20 | - |
| 133 | Явачная кніга 4 студзеня – 30 ліпеня 1843 | 118 | 121 | - |
| 134 | Тое ж 29 ліпеня 1844 | 61 | 85 | - |
| 135 | Тое ж 1843 | 26 | 61 | - |
| 136 | Крапасная кніга 25 студзеня – 28 лютага 1844 | 31 | 20 | - |
| 137 | Явачная кніга 7 студзеня – 20 кастрычніка 1844 | 40 | 36 | - |
| 138 | Тое ж 27 красавіка – 19 лістапада 1844 г. | 102 | 111 | - |
| 139 | Тое ж 9 студзеня – 13 ліпеня 1845 | 100 | 71 | - |
| 140 | Тое ж 15 ліпеня – 16 лістапада | 140 | 81 | - |
| 141 | Тое ж 19 лістапада – 31 снежня 1845 | 48 | 30 | - |
| 142 | Тое ж 25 мая – 6 лістапада 1846 | 97 | 138 | - |
| 143 | Тое ж 6 лістапада – 31 снежня 1846 | 58 | 45 | - |
| 144 | Тое ж 3 студзеня – 24 мая 1846 | 108 | 61 | - |
| 145 | Тое ж па 31 ліпеня 1847 | 144 | 115 | - |
| 146 | Тое ж 4 жніўня – 3 студзеня 1848 | 116 | 235 | - |
| 147 | Тое ж 1848 | 209 | 201 | - |
| 148 | Тое ж 1849 | 118 | 117 | - |
| 149 | Тое ж 1850 | 32 | 26 | - |
| 150 | Абвяшчэнні аб згарэўшых дакументах 1763 | 6 | 1 | - |
| 151 | Пратакол унясенняў | 92 | | - |
| | | | | |
| | У суме<br>Заўвагі: у актавай кнізе з 1810 – па 19 ліпеня 1812 […] 22 дакументаў трэба думаць 16-ць. У выніку за вылікам 6-ці дакументаў, […] сумнеўных дакументаў тысяча семсот шаснаццаць. | 26632 | 23378 | 1530 |

**Кароль М.М.**

## БАРАЦЬБА З ЭПІДЭМІЯМІ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў XIX СТ.: ПА МАТЭРЫЯЛАХ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА АРХІВА БЕЛАРУСІ[1]

Халера закранула ўсю тэрыторыю Беларусі і хвалямі праходзіла па беларускіх губернях на працягу ўсяго XIX ст. Найбольш яна лютавала ў 1830, 1848, 1853, 1856, 1860–1870-я, 1893, 1910 гг. Халера належыць да вострых інфекцыйных захворванняў, пры адсутнасці лячэння яна можа скончыцца смяротным вынікам за некалькі гадзін. Але першапачаткова крыніцы яе ўзнікнення і шляхі распаўсюджвання вызначаліся няправільна. Існавала памылковае ўяўленне аб тым, што прычынай хваробы з'яўлялася не бактэрыя віда «Vibrio cholerae», а так званыя «міязмы» – пахі шкоднага паветра балотаў або адкідаў жыццядзейнасці чалавека. Узровень прафілактычных мер адпавядаў тагачасным уяўленням і ўзроўню медыцыны[2].

Мясцовымі органамі ўлады ажыццяўляліся мерапрыемствы па прадухіленні распаўсюджання халеры. Рабілася захады, каб зменшыць магчымасць кантактаў з заражанымі асобамі: закрыццё школ і адпраўка вучняў на канікулы, адмена масавых мерапрыемстваў, абавязковай з'яўлялася ізаляцыя хворых і памерлых, ствараліся заставы для спынення і праверкі суднаў, якія накіроўваліся з небяспечных у эпідэмічным плане месцаў. У мястэчку Ула Віцебскай губерні ў 1831 г. падчас эпідэміі халеры была арганізавана абсервацыйная застава [2, арк. 2]·

У канцы XIX ст. пасля адкрыцця французскага хіміка Луі Пастэра, які даказаў сувязь паміж хваробай і мікробамі, стала зразумелым, што халеру выклікае брудная вада. Пачалі друкавацца і распаўсюджвацца сярод насельніцтва новыя правілы, якія акрэслівалі тое, як засцерагчыся ад хваробы.

Для барацьбы з халерай і іншымі захворваннямі ў 1852 г. былі ўтвораны губернскія камітэты грамадскага (народнага) здароўя. У склад камітэтаў уваходзілі губернскі і павятовы маршалкі дваранства, кіраўнік Палаты дзяржаўных маёмасцей, інспектар губернскай урачэбнай управы, старшы ветэрынарны ўрач, паліцмайстар (або гараднічы), гарадскі галава, прадстаўнік духавенства. Яны функцыянавалі да 1865 г., затым, з улікам паляпшэння эпідэмічнай сітуацыі, іх функцыі былі перададзены урачэбным аддзелам губернскіх праўленняў.

Прасочым супрацьэпідэмічныя, санітарныя і гігіенічныя мерапрыемствы, якія прымаліся ў гэты час на прыкладзе з халерай у павятовым горадзе Лепель і мястэчку Бешанковічы Віцебскай гу-

[1] Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы БРФФД, Грант Г21М-011.

берні. 18 ліпеня 1853 г. Лепельскі земскі спраўнік рапартаваў, што на халеру захварэла чатыры чалавекі, памёр адзін [10, арк. 2]. З цягам часу становішча пагоршылася. Масава сталі хварэць мясцовыя жыхары і прыезджыя гандляры.

Мясцовым жыхарам забаранялася спажываць шкодную ежу, гародніну і розныя ягады [10, арк. 4 адв.]. Зрэшты, такі падыход сумяшчаў у сабе як навуковыя падставы, так і звычайныя забабоны. Адна яўрэйка з Полацка казала, што захварэла на халеру, бо «ў дарозе паела агуркоў» [10, арк. 5]. У хворых назіраліся наступныя праявы захворвання на халеру: ваніты, дыярэя, курчы рук і ног, астуджэнне ўсяго цела, страта голасу, затрымка мачы.

Хворых адпраўлялі ў адмысловыя халерныя бальніцы [10, арк. 17]. Але не ўсе населеныя пункты былі ў дастатковай ступені забяспечаныя неабходным памяшканнямі, урачамі і сродкамі лячэння і засцярогі. Гэта тычылася шпіталёў. іх персаналу, а таксама медыкаментаў.

Нават у Лепелі, які меў статус павятовага горада, адсутнічала адмысловая ізаляваная бальніца для хворых на халеру. Таму мясцовыя ўлады ў ліпені 1853 г. прасілі губернскае кіраўніцтва аб адкрыцці бальніцы і прызначэнні для барацьбы з эпідэміяй халеры асобнага ўрача. На гэтую пасаду меркавалася прызначыць доктара Рымашэўскага.

Часцей за ўсё, гарадскія ўлады заключалі кантракт з кім-небудзь з мясцовых жыхароў на арэнду памяшкання пад патрэбы бальніцы. Так адбылося і ў дадзеным выпадку. 3 кастрычніка 1853 г. кантракт на перадачу памяшкання пад халерны шпіталь быў заключаны з жыхаром Лепеля Нахімам Гейльманам. Ён здаў свой дом у арэнду па кошце 20 рублёў у месяц [10, арк. 38].

У Лепелі, як ва ўсіх гарадах Расійскай імперыі, ў 1850-я гг. бушавала эпідэмія азіяцкай халеры. Да найбольш распаўсюджаных яе сімптомаў адносіліся агульная слабасць, боль, ціск пад сэрцавай ямкай, прыгнечаны маральны стан, рэзь у жываце, млоснасць, рвота, дыярэя, карчы канечнасцяў, моцнае зморванне, знікненне пульсу і мачааддзялення. Паступова хворы нібы ледзянеў, сімптомы пераходзілі ў «тыф» або хворы паміраў [8, арк. 1 адв.].

Эпідэмія закранала ў той ці іншай ступені ўсе населеныя пункты Лепельскага павета. З мэтай кантролю справаздачы аб стане захворванняў на халеру падаваліся штотыднёва [9, арк. 2].

Шмат у чым распаўсюджанне халеры было звязана з перасоўваннем войскаў. Віцебская ўрачэбная ўправа ў ліпені 1856 г. адзначала, што з 1 ліпеня 1856 г. у шпіталі губерні стала паступаць шмат хворых на халеру менавіта з розных палкоў, якія праходзілі праз тэрыторыю Беларусі.

Зразумела, што ад халеры цярпела і цывільнае насельніцтва, і не толькі ў гарадах, але і ў сельскай мясцовасці. У маёнтку Цяпіншчына памешчыка Лісоўскага ў перыяд з 9 па 19 чэрвеня 1856 г. захварэлі 54 чалавекі, з якіх 16 памерлі. Але ўжо па стане на канец кастрычніка 1856 г. ў вёсках памешчыка Лісоўскага эпідэмія скончылася.

У ліпені 1856 г. у вёсцы Запруддзе памешчыка Вінцэнта Лускіны з'явілася халера сярод сялян. Сімптомы былі тыповымі для дадзенай эпідэміі: панос, рвота, карчы, боль у грудзях. Паводле першасных звестак, захварэлі 15 чалавек. Для барацьбы з дадзенай успышкай былі ўжыты наступныя захады. Павятовым урачом Бышэўскім быў складзены акт аб санітарным і эпідэмічным стане ў маёнтку Асінаўка памешчыкаў Юзафа і Вінцэнта Лускінаў. На падставе складзеных тым жа ўрачом рэкамендацый землеўласнікі арганізавалі размяшчэнне хворых у асобных лазарэтах, забяспечаных лекавымі сродкамі [3, арк. 15].

Лячэнне заразных хвароб, асабліва тых, якія з'яўляліся масавымі і неслі неверагодную небяспеку для насельніцтва, часта сутыкаліся з супраціўленнем з боку людзей, якія не спяшаліся выконваць распараджэнні ўрачоў. Так здарылася і ў выпадку памешчыка В. Лускіны.

Па-першае, земскі ўрач настойваў на тым, што памешчыкі павінны карміць хворых сялян іншым хлебам, бо ўзоры хлеба з маёнтка, прадстаўленыя ў земскую паліцыю, правакавалі страўнікавыя хваробы і не дапамагалі ў лячэнні халеры [3, арк. 16 адв.].

У сваю чаргу В. Лускіна з часам наогул адмовіўся выконваць рэкамендацыі ўрачоў. Ён заявіў, што сам у стане вырашыць, як лячыць сялян, бо «вашы лекі аказаліся шкоднымі». Землеўласнік прадставіў уласны план лячэння выпадкаў захворвання на халеру, які ўжо ў тыя часы з пункту гледжання медыцынскай навукі выглядаў непераканаўчым. Памешчык меркаваў лячыць халеру наступнымі сродкамі: мыццё ў цёплай вадзе, лімон, вапнавая вада, шкіпінар і перац. На думку В. Лускіны, крыніцай узнікнення халеры з'яўляліся глісты. Таксама побач з хворымі ў маёнтку не было фельчара, які мог бы аказаць кваліфікаваную дапамогу. Але затым землеўласнік усё-такі пагадзіўся выконваць рэкамендацыі павятовага ўрача Бышэўскага.

У ліпені 1856 г. была зафіксавана ўспышка халеры ў Полацку, якая таксама была выклікана праходам войскаў праз горад. Захварэла больш за 20 чалавек. У сувязі з гэтым у горадзе паўстала неабходнасць у дадатковым памяшканні для халернай бальніцы [4, арк. 12]. Наогул адсутнасць памяшканняў, якія б дазвалялі ізаляваць хворых на халеру ад іншых пацыентаў, востра стаяла перад уладамі.

Найбольш зручным рашэннем у полацкім выпадку стала арэнда памяшканняў у мясцовых жыхароў. У 1847 г. свой дом для перааўладкавання ў часовую халерную бальніцу перадаў мешчанін Восіп Антонавіч Сімановіч [11, арк. 133].

У Віцебску падчас халеры мяшчане таксама за плату здавалі дамы пад халерныя бальніцы [6, арк. 32].

Для барацьбы з эпідэмічнымі захворваннямі санітарныя нормы прымаліся на ўзроўні усёй імперыі. Яны падпісаваліся непасрэдна імператарам. Так, падчас эпідэміі халеры быў разасланы імператарскі ўказ (у Віцебскую губерню было накіравана 73 яго асобнікі), у якім выкладаліся правілы, што тычыліся знішчэння смуроду. У дакуменце вялікая ўвага надавалася ачышчэнню адыходных месцаў і памыйных ям [7, арк. 4].

Значным мерапрыемствам на месцах, накіраваным на супрацьдзеянне росту захворванняў, быў кантроль за якасцю ежы. Усе прадукты, якія траплялі ў гарады, падлягалі праверцы. У 1830–1831 гг., акурат падчас эпідэміі халеры, ажыццяўляўся агляд транспарту з садавінай, які заязджаў у Віцебск. Насельніцтву даваліся парады не ўжываць сырую садавіну і гародніну, а замачваць яе або саліць [11, арк. 4].

Зразумела, што з халерай сутыкаліся не толькі звычайныя жыхары гарадоў і вёсак. Востра праблема заразных захворванняў стаяла і сярод людзей, якія адбывалі зняволенне ў турме. Халера не абышла бокам і Віцебскі турэмны замак. Яго наглядчык у жніўні 1853 г. паведамляў, што арыштанты паміраюць ад халеры, бо турма не забяспечана нават мінімальнай колькасцю медыцынскіх прэпаратаў. У рапарце адзначалася, што адсутнічалі базавыя запасы спірту, палыну і іншых засцерагальных сродкаў, з дапамогай якіх можна было аказваць медыцынскую дапамогу зняволеным [5, арк. 75].

Халера да пачатку ХХ ст. заставалася самай небяспечнай хваробай, якая забірала больш за ўсё жыццяў. Эфектыўнасць барацьбы з ёй зніжалася з-за няведання яе сапраўднага ўзбуджальніка і спосабу перадачы, а таксама з-за забабонаў і недастатковай інфармаванасці насельніцтва. Сітуацыя карэнным чынам пачала мяняцца толькі ў пачатку ХХ ст.


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 4673.
2. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 2620.
3. НГАБ. – Ф. 2657. Воп. 1. Спр. 12.
4. НГАБ. – Ф. 2657. Воп. 1. Спр. 14.
5. НГАБ. – Ф. 2657. Воп. 1. Спр. 23.
6. НГАБ. – Ф. 2657. Воп. 1. Спр. 26.
7. НГАБ. – Ф. 2657. Воп. 1. Спр. 30.
8. НГАБ. – Ф. 2657. Воп. 1. Спр. 6.
9. НГАБ. – Ф. 2657. Воп. 1. Спр. 9.
10. НГАБ. – Ф. 2657. Воп. 1. Спр. 1.
11. НГАБ. – Ф. 2657. Воп. 1. Спр. 4.


**Игнатьева А.А.**

## ИНФОРМАЦИОННЫЙ ПОТЕНЦИАЛ АРХИВОВ РОССИЙСКОЙ ФЕДЕРАЦИИ ПО СОСТАВЛЕНИЮ БИОГРАФИЙ ДВОРЯН БЕЛОРУССКО-ЛИТОВСКИХ ГУБЕРНИЙ – У ЧАСТНИКОВ ВОЕННОЙ КАМПАНИИ 1812 Г. В СОСТАВЕ ОФИЦЕРСКОГО КОРПУСА РОССИЙСКОЙ АРМИИ

Сохранение памяти народа о наиболее значимых военных событиях прошлого входит в приоритетное направление политики белорусского государства. Не исключением является война 1812 г. и ее участники. Выявление имен дворян-уроженцев белорусских земель, принявших участие в боевых действиях в составе офицерского корпуса российской армии, представляет не только научный интерес, но и помогает сформировать национальную позицию по данному историческому событию, увековечить память героев. Обращение именно к дворянскому сословию не случайно. Во-первых, в начале XIX века дворянство являлось высшим сословием Российской империи, которое задавало вектор дальнейшего развития общества, во-вторых, оно представляло собой служилое сословие, и военная служба была одним из вариантов построения карьеры и служения обществу (не случайно, более 80 % офицерского корпуса российской армии приходилось именно на дворянство), в-третьих, именно на дворянство, наделенное всеми полномочиями власти над остальным населением, в наиболее сложный исторический период возлагалась обязанность возглавить и организовать защиту отечества [1, с. 77]. Таким образом, обоснованность решения обозначенной проблемы предполагает проведение комплексного исследования по выявлению дворян белорусско-литовских губерний –участников военных событий 1812 г. в составе офицерского корпуса российской армии и составлению их биографий.